**Факультэт давузаўскай падрыхтоўкі
і навучання замежных студэнтаў**

**Кафедра давузаўскай падрыхтоўкі і прафарыентацыі**

Прэзентацыя па беларускай мове па тэме

# «ПРАВАПІС і ЎЖЫВАННЕ *НЕ (НЯ)*, *НІ* з рознымі часцінамі мовы»

Складальнік – дацэнт С.В. Чайкова

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф. СКОРИНЫ

# ПРАВАПІС і ЎЖЫВАННЕ *НЕ (НЯ), НІ* з рознымі часцінамі мовы: План



1) правапіс ***не*** (***ня***) разам;
2) правапіс ***не*** (***ня***) асобна;
3) значэнне і ўжыванне часціцы ***не***;
4) значэнне і ўжыванне часціцы ***ні***.
5) правапіс ***ні*** (***ані***).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф. СКОРИНЫ

# ***не*** (***ня***) **пішацца разам**

## (***з'яўляецца прыстаўкай***)

- калі слова без не (ня)- не ўжываецца: *непагадзь, няўклюда, неадольны, нездаровіцца, непакоіць, ненавідзячы, неабходна, нельга, неўпапад;*
- калі не (ня-) надае назоўнікам, прыметнікам, прыслоўям значэнне, процілеглае таму, што маюць цэлыя словы без яе (можна замяніць сінонімам без не): *няшчасце (гора), непрыяцель (вораг), нямнога (мала*);
- калі не-(ня-) надае назоўнікам значэнне адмаўлення таго, што абазначаюць яны без яе: *кніга прачытана для неспецыялістаў;*
- у дзеясловах і вытворных ад іх словах у складзе прыстаўкі *неда-*, якая абазначае неадпаведнасць патрэбнай нормы: *недаглядзець, недаацэнка*

(Заўвага! Трэба адрозніваць дзеясловы з прыстаўкай да-, якая абазначае недаведзенае да канца дзеянне (разам з адмаўленнем ***не***): *не дагаварыць*);

- з поўнымі дзеепрыметнікамі, калі яны не маюць пры сабе паясняльных слоў: *неасушанае балота*;
- з прыметнікамі, дзеепрыметнікамі, прыслоўямі, пры якіх ужываюцца паясняльныя словы са значэннем ступені якасці: *абсалютна, амаль, вельмі, выключна, зусім, надзвычай, надта, поўнасцю, у вышэйшай ступені, часткова, цалкам: вельмі нялегка, зусім непрадуманае выступленне;*
- з няпэўнымі займеннікамі і прыслоўямі, калі на ***нé-*** прыпадае націск: *нéхта, нéдзе, нéкуды, нéкалі, нéяк, нéльга, нéхаця.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф. СКОРИНЫ

## ***не*** (***ня***) пішацца **АСОБНА** (***з'яўляецца часціцай***)

- ад назоўнікаў, прыметнікаў і прыслоўяў, калі пры іх ёсць (трэба, каб былі словы-антонімы) або падразумеваецца супрацьпастаўленне: *не праўда, а хлусня; не блізкі, а дальні;*
- ад слоў варта, супраць, трэба, шкада, якія выступаюць у ролі выказніка ці аднаго з яго кампанентаў: *для сябра нічога не шкада; не трэба скардзіцца на лёс*;
- ад формаў вышэйшай ступені параўнання прыметнікаў і прыслоўяў: *не лепшы за іншых; не вышэйшы за свайго сябра;*
- ад дзеясловаў і дзеепрыслоўяў: *не напісаў, не шкадуючы;*
- ад поўных дзеепрыметнікаў пры наяўнасці паясняльных слоў: *не засеянае калгаснікамі поле;*
- ад кароткіх дзеепрыметнікаў: *поле не засеяна, работа не залічана;*
- у складзе ўзмацняльных адмоўяў: *далёка не, даўно не*: *далёка не прадуманае рашэнне;*
- са спалучэннем *яшчэ не*: *яшчэ не напісаны ліст;*
- ад прыслоўяў, якія заканчваюцца не на *-а* (пішуцца па агульным правілам): *не замужам, не вельмі;*
- са словамі *ніколі, нікому, нікольні, нікім, нічым*: *ніколі не бачаны горад, нікому не сказанае дзякуй;*
- ад займеннікаў: *не я, не ты;*
- ад займеннікаў і прыслоўяў, калі на часціцу *не* націск не падае: *не інакш;*
- ад лічэбнікаў: *не адзін, не два;*
- ад часціц: *не толькі;*
- ад прыназоўнікаў: *пакладзі кнігу не на стол а ў партфель;*
- ад выклічнікаў: *не ах, а ох;*
- ад слоў, якія пішуцца праз злучок: *не па-летняму, не абы-хто;*
- у складзе злучнікаў *не то… не то*: *баліць галава – не то ад спякоты, не то ад хвалявання*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.
СКОРИНЫ

# Значэнне і ўжыванне часціцы *не*

| *Значэнне часціцы не* | *Калі ўжываецца* | *Прыклады* |
|---|---|---|
| Адмаўленне | Калі ў сказе дзве часціцы ***не*** – адна перад дапаможным дзеясловам, а другая – перад інфінітывам | |
| Сцвярджэнне | ***Не*** + магчы + ***не*** + інфінітыў | *Гэту песню не спець не магу я.* |
| | Калі ***не*** стаіць пасля злучніка *пакуль,* часціц *ледзь, чуць* | *Госці склалі свае рэчы на падлозе, заняўшы імі ледзь не палову пакоя.* |
| | У спалучэннях *як не, хто не, дзе толькі не, куды не,* якія ўжываюцца ў рытарычных пытальных сказах | *Як не любіць старонку тую, дзе я радзілася, расла?* *Як не спяваць мне?* |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф. СКОРИНЫ

# Значэнне і ўжыванне часціцы *ні*

| *Значэнне часціцы ні* | *Калі ўжываецца* | *Прыклады* |
|---|---|---|
| Узмацненне адмаўлення | ***Не*** + дзеяслоў + ***ні*** з назоўнікам /займеннікам/прыслоўем<br>***Не*** + словы ***трэба, шкада, варта*** або словы ***няма, нельга, няможна*** + ***ні*** з назоўнікам /займеннікам/прыслоўем/дзеясловам | *Навокал не відаць ні агеньчыка, не чуваць ні гуку.*<br>*На вуліцы няма ні душы.*<br>*Не шкада ні яе, ні яго.*<br>*Не трэба ні ехаць, ні ляцець.*<br>*Нам нельга ні піць, ні курыць.* |
| | У няпоўных сказах, у якіх прапушчаны выказнік з адмоўем | *Толькі глядзі, мама, **нікому ні слова**, ані-ані.* (прапушчаны выказнік з адмоўем – *не гавары*) |
| Узмацненне сцвярджэння | У складзе злучнікаў што (б) ***ні***, хто(б) ***ні***, як (бы) ***ні***, куды (б) ***ні***, дзе(б) ***ні***, колькі (б) ***ні***, калі (б) ***ні***, каб ***ні***, чый ***ні***, які ***ні***, якімі пачынаецца дадаеная частка складаназалежнага сказа | *Чалавек на зямлі, хто б ён ні быў: воін ці будаўнік, – перш за ўсё сейбіт.*<br>*Куды ні глянь, усё бялюткa.* |
| Значэнне злучніка ў адмоўным сказе | можна замяніць злучнікам ***і*** | |
| Няўпэўненасць | Ва ўстойлівых выразах (фразеалагізмах) | *ні тое ні сеё, ні села ні пала, ні ўзад ні ўперад, ні складу ні ладу, ні рыба ні мяса, ні жывы ні мёртвы, ні прайсці ні праехаць, ні хаты ні лапаты, ні кала ні двара, ні свет ні зара, ні раз ні два* |
| у пабуджальных сказах з загаднай інтанацыяй | | *Ні кроку назад* |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф. СКОРИНЫ

# Правапіс *ні* (*ані*)

| *Пішацца разам* | *Пішацца асобна* |
|---|---|
| • з адмоўнымі займеннікамі і прыслоўямі і вытворнымі ад іх словамі (калі паміж часціцай ***ні*** і займеннікам ці прыслоўем няма прыназоўніка): *ніхто, нікога, нічога, нічым, нічый, нічыйны;* <br> • са словамі, якія без ***ні*** не ўжываюцца: *ніколечкі, ніводны, нікчэмны, нішчымны* | • з назоўнікамі: *ні чалавек, ні жывёла;* <br> • пры наяўнасці прыназоўніка паміж часціцай і займеннікам: *ні з кім, ні з чым, ні ў каго́ (ко́га)* |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф. СКОРИНЫ